**Білет 17**

**Практычнае заданне.**

**Станаўленне беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці. Удзел БССР у стварэнні СССР. Узбуйненне тэрыторыі БССР.**

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні (выканайце заданні):**

1. Якая гістарычная падзея стала перадумовай (зрабіла магчымым) утварэнне Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі (ССРБ)? Пацвердзіце свой адказ цытатай з дакумента.
2. Чаму беларуская дзяржава называлася савецкай? Свой адказ пацвердзіце цытатай з прадстаўленых матэрыялаў.
3. Якая была форма дзяржаўнага ладу ў Саюзе Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік? Колькі рэспублік аб'ядналася ў СССР у 1922 годзе?
4. Складзіце храналагічную табліцу (або лагічны ланцужок) па тэме: «Фарміраванне тэрыторыі БССР у 1921–1926 гадах». Якія гістарычныя падзеі паўплывалі на працэс фарміравання тэрыторыі рэспублікі ў гэты перыяд?

**I. З Маніфеста Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада Беларусі** *(1 студзеня 1919 г.)*

Таварышы і браты працоўныя, бедныя сяляне і чырвонаармейцы Беларусі!

… Вялікая Кастрычніцкая рэвалюцыя ў Расіі… заклала падмурак новага ўкладу жыцця з уладай працоўнага народа.

… Сярод працоўных народаў Расіі, Літвы, Украіны і Латвіі з сягонняшняга дня становіцеся і вы свабоднымі і паўнапраўнымі гаспадарамі свабоднай незалежнай Беларускай сацыялістычнай рэспублікі. З сягонняшняга дня Беларусь – Савецкая Рэспубліка – становіцца рэспублікай працоўнага народа, рабочых, сялянскай беднаты, чырвонаармейцаў Беларусі.

Часовы Рабоча-сялянскі ўрад ... абвяшчае ўсяму свету: з гэтага моманту ўся ўлада ў Беларусі належыць толькі Саветам рабочых, сялянскіх, батрацкіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў.

**II. Удзел БССР ва ўтварэнні Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.** *(па матэрыялах вучэбнага дапаможніка «Гісторыя Беларусі. 1917 г. – пачатак XXI ст. 9 клас»).*

У працэсе пошуку і выпрацоўкі канкрэтных формаў аб'яднання савецкіх рэспублік у адну дзяржаву І. В. Сталін выступіў з ідэяй «аўтанамізацыі». Згодна з ёй усе савецкія рэспублікі павінны былі аб'явіць сябе састаўнымі часткамі Расійскай Савецкай Федэратыўнай Сацыялістычнай Рэспублікі (РСФСР) і ўвайсці ў яе склад на правах нацыянальна-культурнай аўтаноміі. У.І. Ленін прапанаваў іншую форму дзяржаўнага ладу - федэрацыю. Яна ўяўляла сабой саюз некалькіх дзяржаў, у якім яны падпарадкоўваюцца адзінаму цэнтру і пры гэтым захоўваюць самастойнасць у вырашэнні асобных пытанняў унутранай палітыкі.

Ідэя У.І.Леніна была падтрымана на IV Усебеларускім з'ездзе Саветаў у снежні 1922 г. у Мінску. Дэлегаты з'езда аднагалосна адобрылі ідэю стварэння Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік (СССР).

30 снежня 1922 г. дэлегацыі Расійскай Сацыялістычнай Федэратыўнай Савецкай Рэспублікі (РСФСР), Украінскай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі (УССР), Беларускай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі (БССР) і Закаўказскай Сацыялістычнай Федэратыўнай Савецкай Рэспублікі (ЗСФСР – Арменія, Грузія, Азербайджан) на Усесаюзным з'ездзе Саветаў падпісалі Дэкларацыю і Дагавор аб утварэнні СССР.

Урад СССР выдаў дэкрэт аб перадачы Беларускай ССР паветаў Віцебскай, Гомельскай і Смаленскай губерняў, якія раней уваходзілі ў РСФСР, у якіх большасць насельніцтва складалі беларусы.

**III. Картасхема. Тэрыторыя БССР у 1921–1926 гг.**

